Канчакоўна («Князь Ігар» А. Барадзіна), Любоў, Салоха («Мазепа» і «Чаравічкі» П. Чайкоўскага), Кармэн («Кармэн» Ж. Бізэ), Азучэна («Трубадур» Дж. Вердзі), Часнікова («Страшны двор» С. Манюшкі) і інш.

*Л. П. Івашкоў.*

**ЦЭХІ РАМЕСНЫЯ,** аб'яднанні рамеснікаў адной ці некалькіх блізкіх прафесій у феадальных гарадах. Ствараліся з мэтай абароны рамеснай вытворчасці ад самавольства феадалаў, канкурэнцыі інш. рамеснікаў ва ўмовах вузкага ўнутр. рынку, манапалізацыі вытворчасці і збыту прадукцыі, абароны агульных і асабістых правоў. Унутр. дзейнасць Ц. р. вызначалася статутамі, якія рэгламентавалі вытворчасць і збыт прадукцыі, якасць сыравіны і гатовых вырабаў, тэхналогію вытв. працэсу, час і ўмовы работы, арганізацыю навучання і інш. Цэхі кантралявалі паводзіны сваіх членаў, каладжвалі ўзаемадапамогу.

У краінах Зах. Еўропы росквіт Ц. р. прыпадае на 13—14 ст. У стараж.-рус. гарадах рамесныя аб'яднанні паявіліся ў 11—12 ст., найб. развіцця дасягнулі ў 16—17 ст. На тэр. Беларусі першыя Ц. р. ўзніклі ў 15 ст. з наданнем гарадам магдэбургскага права (ім папярэднічалі аб'яднанні рамеснікаў, якія не мелі пісьмовых статутаў), пашырыліся ў 16 ст. У цэлым бел. Ц. р. развіваліся па зах.-еўрап. ўзор, аднак мелі некат. асаблівасці: яны спалучалі традыц. нормы рамесных аб'яднанняў стараж.-рус. гарадоў з новаўвядзеннямі магдэбургскага права; пераважалі мяшаныя цэхі, якія складаліся з работнікаў некалькіх спецыяльнасцей; ім характэрна канфесіянальная цярплівасць. На чале цэхаў стаялі «старосты» («цэхмайстры»); паўнапраўнымі членамі Ц. р. былі майстры, ім падпарадкоўваліся чаляднікі («таварышы»), вучні («хлопцы»). Цэхавыя рамеснікі знаходзіліся пад юрысдыкцыяй магістрата і феадалаў. Ц. р. ўдзельнічалі ў грамадскім жыцці горада, неслі вайсковую і інш. павіннасці на карысць дзяржавы. Пераважалі цэхі па апрацоўцы металу; былі пашыраны: па апрацоўцы скур, вырабу адзення, хатняга начыння, будаўнічыя. Жывапісцы, скульптары, дойліды звычайна далучаліся да інш. цэхаў (сталяроў, муляраў, ткачоў і інш.). У 16—17 ст. па-мастацку аздобленыя рэчы рабілі цэхі ювеліраў у Мінску, Полацку, Слуцку, Брэсце, Гродне, Магілёве, Пінску, Віцебску, Міры (Карэліцкі р-н) і інш. Значную ролю адыграў Віленскі цэх злотнікаў, дзе ў 16—18 ст. вучылася і працавала шмат выхадцаў з Беларусі. Вял. ўвага ў рабоце Ц. р. аддавалася як выкарыстанню прагрэс. тэхнікі і тэхналогіі, так і віртуознасці выканання, выкарыстанню маст. узораў, гарманічнасці спалучэння традыцый і наватарства, адпаведнасці пануючаму маст. стылю. Прадукцыя цэхаў была найчасцей ананімная: подпісы (імёны, прозвішчы, манаграмы) на абразах і партрэтах 17 ст. сустракаюцца выключна рэдка, толькі некат. злотнікі пастаянна карысталіся спец. клеймамі [вядомы клеймы Пятра Данілевіча (PD), Антона Шмеля (A S) і інш.]. З 2-й пал. 18 ст. з узнікненнем мануфактур пачаўся заняпад Ц. р. У 1890 скасаваны цэхі Гродзенскай і Віцебскай губерняў. У 1926—39 працавала некалькі Ц. р. у Гродне.

*Літ.:* Игнатенко А. П. Ремесленное производство в городах Белоруссии в XVII—XVIII вв.— Мн., 1963; Копысский З. Ю. Экономическое развитие городов Белоруссии в XVI — первой половине XVII в.— Мн., 1966; Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI—XVIII вв.— Мн., 1975; Высоцкая Н. Ф. Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва Беларусі XII—XVIII стагоддзяў: [Альбом].— Мн., 1984.

*Э. С. Максімава.*

**ЦЮНТ** (Zündt, Zinck, Zintt, Zyndler, Zynndt, Zynnth) Маціс [Мацей; 1498 (?) — 25.2.1572], нямецкі гравёр, ювелір. Працаваў у Нюрнбергу. Выканаў вялікую колькасць гравюр (геагр. карты, партрэты гіст. асоб, сцэны значных паліт. падзей, віды гарадоў, алегорыі па матывах біблейскіх і міфал. сюжэтаў, гербы, экслібрысы і інш. У 1567—68 з малюнка І. Адэльгаўзера выканаў гравюру, якая ілюструе прыём у Гродне Жыгімонтам II Аўгустам паслоў Івана IV (т. зв. Гравюра Гродна). Гравюра (памеры 103×35,3 см) мае панарамную выяву забудовы аднаго з буйнейшых бел. гарадоў сярэдзіны 16 ст., адлюстроўвае некаторыя дэталі гарадскога побыту. У 17—18 ст. з яе неаднаразова рабіліся паўторы (менш падрабязныя ў параўнанні з арыгіналам). Арыгінальныя адбіткі гравюры захоўваюцца ў бібліятэках Львоўскай навук. імя Стафаніка і Публічнай імя Салтыкова-Шчадрына ў Ленінградзе.




**М. Цюнт.** Фрагмент з гравюры г. Гродна. 1567—68.

*Р. В. Баравы, А. А. Трусаў.*

**ЦЮРКІЗМЫ,** словы, запазычаныя з цюркскіх моў.

Частка лексічных сродкаў цюркскага паходжання захавалася ў бел. мове ад стараж. рус. эпохі: «арда», «атаман», «баскак», «басурман», «бісер», «ярлык». Большасць Ц. запазычана ў перыяд самаст. развіцця старабел. мовы (14—17 ст.) у выніку непасрэдных кантактаў (гандлёвыя, дыпламатычныя і інш.) бел. насельніцтва з цюркскімі народамі (пераважна з крымскімі татарамі) і праз пасрэдніцтва суседніх моў — рус., укр. і польскай. З 15—17 ст. у бел. мове ўжываюцца Ц. бытавога характару: «аршын», «атлас», «барсук», «барыш», «буланы», «бурка», «буры», «казак», «капшук», «караван», «каўпак», «кафтан», «кілім», «кішэнь», «кумыс», «кутас», «магарыч», «мячэць», «нагайка», «саф'ян», «султан», «тафта», «харч», «чапрак», «шаравары» і інш. Слоўнікі бел. мовы фіксуюць рад устарэлых Ц.: «апанча», «армяк», «казна», «камка», «кісцень», «таф'я». Некаторыя Ц. перайшлі ў разрад *гістарызмаў*: «бунчук», «есаул», «калчан», «ківер», «мурза», «сагайдак», «тамга», «янычар», «ясыр». У сучасную бел. мову Ц. запазычваюцца праз рус. мову. Гэта пераважна экзатызмы (гл. *Экзатычная лексіка*): «акын», «бархан», «басмач», «гюрза», «калым», «кізіл», «кішлак», «кунак», «саксаул». Бел. пісьменнікі выкарыстоўваюць Ц. ў творах на гіст. тэматыку і пры перакладзе твораў з цюркскіх моў для стварэння адпаведнага каларыту.

*Літ.:* Булыка А. М. Лексічныя запазычанні ў беларускай мове XIV—XVIII стст.— Мн., 1980.

*А. М. Булыка.*

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ